**Сосна, К.** Для будучых салдат мы памяць збераглі / К. Сосна // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2014. — 15 лют. — С. 2.

# ДЛЯ БУДУЧЫХ САЛДАТ МЫ ПАМЯЦЬ ЗБЕРАГЛІ

Валерый Лазовік пасля заканчэння Радзюкоўскай базавай школы з 1975 па 1979 гады вучыўся ў Ільянскім саўгасе-тэхнікуме, што ў Вілейскім раёне, па спецыяльнасці «ветэрынарыя». Затым маладому хлопцу надышоў тэрмін аддаць воінскі доўг Радзіме і яго прызвалі на воінскую службу. Валерый трапіў у адну з часцей, якая дыслацыравалася ў Свярдлоўскай вобласці. Пасля двух месяцаў трэніровак «у вучэбцы», а гэта было 2 студзеня 1980 года, іх полк паднялі па трывозе і адправілі ў Афганістан, у горад Кандагар. Воінская спецыяльнасць у маладога байца была санінструктар. Ён знаходзіўся там, дзе ішлі баі, побач з раненымі, каб аказваць ім першую медыцынскую дапамогу. Як вядома з гісторыі, савецкія войскі ўвайшлі ў Афганістан 25 снежня 1979 года, і рота, у якой служыў Валерый, была адной з першых на чужой зямлі. Давялося жыць у палатках, адсутнічалі ўсялякія ўмовы, нават ліст напісаць дадому не было чым і на чым. Але стойкасць, мужнасць, салдацкае братэрства дапамагалі прайсці ўсе выпрабаванні. У далёкайусходняй краіне Валерый Лазовік адслужыў два гады.

Вярнуўся ў бацькоўскі дом жывым і здаровым. Пасля месяца адпачынку пайшоў працаваць ветурачом у родную гаспадарку – саўгас імя Маркава. З 1983 па 1989 годы Валерый Іванавіч завочна вучыўся ў Віцебскім ветінстытуце (цяпер акадэмія ветэрынарнай медыцыны).

Пасля двух гадоў працы ў саўгасе малады спецыяліст быў накіраваны на пасаду галоўнага ветурача калгаса імя Ільіча нашага раёна. Далейшы паслужны спіс Валерыя Іванавіча даволі вялікі. Давялося папрацаваць і ў раённым жывёлазабойным цэху, у племстанцыі, а большасць гадоў сваёй прафесійнай дзеёнасці ён аддаў ветлячэбніцы, дзе і цяпер працуе напасадзе вядучага ветурача.

**Кацярына Сосна, фота Андрэя Бурца**